**Мароз, М.** На вайне як на вайне / М. Мароз // Герой працы. — 1996. — 10 лют. — С. 1.

# НА ВАЙНЕ ЯК НА ВАЙНЕ

У рэдакцыю завітаў былы воін-афганец Аляксандр Вараб'ёў і згадзіўся на невялікае інтэрв'ю.

**– Саша, коратка пра тое, як трапіў на вайну. Ці думаў перад прызывам, што давядзецца ваяваць?**

– Ведаеце, калі табе васемнаццаць, пра такое не думаеш. Служыць пачынаў у Паўночнай Асеціі, дзе была вучэбка, а пасля сказалі: вылятаем у Афганістан. Першае, пра што падумалася: значыць, трэба ваяваць. Але страху ці боязі нейкай не было.

– **Дзе прызям ліўся ваш самалёт?**

– З Ташкента прыляцелі ў Кабул. Далі машыну КамАЗ, і год і сем месяцаў адслужыў на чужой зямлі. Выязджаў ва Узбекістан за харчам, за мэбляй і заўсёды пры мне быў аўтамат. Давалі нам бронежылеты, каску. У пачатку службы ўсім гэтым карыстаўся і пад канец – хацелася вярнуцца дамоў жывым. А ў астатні час вісеў у мяне бронежылет у кабіне. Ды ўявіце – пражыць сонца 57 градусаў, а ты ў машыне ў бронежылеце. Задыхаешся, а дарогі там нялёгкія. Так званы серпанцін, калі ўзбіраешся высока ў горы, а пасля спускаешся ўніз.

**– Усё-такі там міліцыі не было, абараняешся сам, разлічваеш ці на выпадак, ці на трапнае вока.**

– На вайне як на вайне. Думаю, страх – не такое агіднае пачуццё, як нехта думае. Адзін умее яго, як кажуць, закілзаць, у іншага ён выліваецца ў труслівасць.

– **Саша, ты родам адкуль?**

– Ды я тутэйшы, з пасёлка «Дабееўскі мох». З раёна і прызываўся. У мяне двое дзяцей, а кватэры не маю. Вось так. Знімаю кватэру, плачу шалёныя грошы.

– **А чаму без жылля?**

– Чаму без жылля? А мяне жыццё трохі пакідала. Адзін раз з'ехаў з сям'ёй на Міншчыну. І толькі ў жніўні сёлета будзе тры гады, як я пастаянна жыву ў Шумілінскім раёне. Закон не дазваляе мне тут карыстацца льготамі, хаця з'ехаў я не ў Маскву, не на Далёкі Усход.

**М. Мароз**